ГОРЕЦКИЙ ВЫБОР

Антибашистская газета

Башизм - «Репрессивный режим, направленный на подавление прогрессивных общественных движений, на уничтожение демократии».

С.И.Ожегов, «Толковый словарь руского языка», на букву «Ф»

№ 17, май 2007г.

Отдайте нам зарплату!

Более полусотни бывших и нынешних работников «Парнаса» месяцами не могут добиться выплаты заработанных денег.

При этом принадлежащий горецкому «олигарху» Игорю Измайловичу ресторан исправно работает и получает доход. Все упирается в юридические формальности. Дело в том, что в последние годы «Парнас» и другие объекты этого предпринимателя формально именовались ЧУП «БелРосСтрой», приняв эстафету у ставшего неплатежеспособным «БелРоса». Нынче же ситуация повторяется с точностью до наоборот. Теперь уже неплатежеспособен «БелРосСтрой», а его имущество (а в основном это – здания) описано хозяйственным судом в счет погашения задолженностей. Пользуясь странной лояльностью местной исполнительной власти, Измайлович снова перевел деятельность «под крылышко» «БелРоса», бросив работавших в «Строе» (вы еще не запутались?) на произвол судьбы.

На сегодняшний день только по удовлетворенным судом искам задолженность по невыплаченной заработной плате составляет у фактически обанкротившейся организации более сорока миллионов рублей. В Горецком суде лежат на исполнении более пятидесяти исполнительных листов. А сроки невыплат тянутся у некоторых людей аж с мая прошлого года.

Мы побеседовали с некоторыми из них.

Александр, бывший сантехник. Ему должны за три месяца чуть более миллиона.

Григорий, работал водителем. С августа 2006-го года по март 2007-го не получил около 2700000 руб.

Сергей, еще один бывший водитель. Не получил почти три миллиона.

И все эти цифры – без учета выплат, которые положены людям за просрочку расчета при увольнении.

В еще более странной ситуации находится Галина, чья трудовая книжка по сей день находится в «БелРосСтрое». Как рассказала женщина, находящаяся «в подвешенном состоянии», после произведенной ревизии материальные ценности, за которые она отвечала, были переведены на баланс «БелРоса», а ей самой предложили уволиться по собственному желанию. Галина отказалась, резонно полагая, что коль у нанимателя нет для нее работы, то он должен ее сократить, выплатив пособие. Долгое время, она исправно ходила на работу, однако кроме настойчивых предложений написать заявление, ничего другого там не слышала. Сейчас она – как в плену: без работы, без денег и без возможности устроиться на новое место – трудовую книжку ей не отдают.

Как могла допустить такое «социально ориентированная» местная вертикаль, остается загадкой – разговаривать с автором на эту тему в райисполкоме по традиции отказались. При этом известно, что принимая решения об удовлетворении исков, Горецкий суд неоднократно направлял в райисполком частные определения о массовых нарушениях администрацией «БелРосСтроя» Указа о ежемесячной выплате зарплаты.

Кстати, встретиться с этой самой администрацией за два дня хождений в «Парнас» так и не удалось. Сменявшие друг друга охранники толком и сами не знали, кто там сейчас руководит, твердо отвечая только одно: Измайлович сейчас в Москве. Телефон же подписывающего документы в качестве директора Г.Г.Бидненко был все время недоступен, а на месте застать его не удалось.

И все же несколько комментариев компетентных людей мы получили.

Известный горецкий юрист (представляться не пожелал):

- Взыскать деньги с ответчика, на мой взгляд, сейчас малореально. Все имущество там описано, автомобили принадлежат частным лицам, а являющийся учредителем «БелРосСтроя» «БелРос» ответственности за свое «детище» согласно Устава предприятия не несет. Единственный способ, который я вижу, объявить эту фирму банкротом, тогда при распродаже имущества бывшим работникам достанется хоть что-то.

Председатель правления Могилевского правозащитного центра Борис Бухель:

- Я, честно говоря, не понимаю такой позиции людей, сидящих без движения и ждущих когда на них «свалятся» деньги. Свои права нужно защищать, иначе можно вообще остаться ни с чем. Тем более, что Закон здесь однозначно на стороне работников.

На всякий случай.

По приглашению нашей редакции Борис Бухель планирует посетить на будущей неделе Горки и встретиться с теми, из обманутых работников, кто намерен что-либо предпринять для удовлетворения своих требований. Консультации будут оказываться бесплатно. О времени и месте встречи желающие могут узнать по телефону 545 89 83.

Иван МОРОЗОВ

Добрались до пенсионеров

На прошлой неделе правительство закинуло очередной «пробный шар», который свидетельствует о неподъемности для экономики существующей пенсионной системы. На пресс-конференции высшие чиновники Министерства труда и социальной защиты рассуждали о том, как тяжело нашей экономике тащить на своих плечах 2,4 миллиона пенсионеров, на содержание которых сегодня идут уже около 11% ВВП. Говорилось, что нагрузка на одного работающего, который сегодня содержит пенсионера, у нас выше, чем даже у стареющей России в полтора раза.

Если порыться в памяти, то каждый вспомнит, что такие волны «ревизионизма» пенсионной системы возникают у нас регулярно в те моменты, когда государство начинает ощущать недостаток средств. В последний раз подобные веянья возникали 3-4 года назад. Даже предпринимались некоторые шаги, чтобы «разрулить» проблему, но позднее волна российских нефтедолларов позволила отложить решение проблемы в дальний, как казалось, ящик. Да недаром говорят, что «халява» долго не живет. Тому в глубинах правительства в сегодняшних непростых экономических условиях вслед за льготниками берутся за пенсионеров.

Попробуем разобраться в сущности проблемы и спрогнозировать возможные действия власти по ее решению. Пенсионная система в нашей стране является солидарной, т.е. сегодняшние трудящиеся содержат сегодняшних пенсионеров. С момента создания в советские времена, когда пенсионеров было относительно мало, эта система позволяла довольно эффективно решать вопрос пенсионного обеспечения. Но сейчас, когда пенсионеров уже больше, чем половина от числа работающих и их количество растет, эта система ложится непосильным бременем на общество.

Совсем иначе работает пенсионное обеспечение в развитых странах. Она построена на том, что каждый человек всю жизнь откладывает средства на собственный пенсионный счет, чтобы после выхода на пенсию пользоваться им. Поэтому такая система и называется персонифицированной. Государства гарантируют сохранность всех пенсионных вложений, жестко контролируют пенсионные и сберегательные фонды, не давая им заниматься ненадежными финансовыми операциями – рисковать вложенными средствами граждан. Поэтому, просуществовав уже более пятидесяти лет, утвердив свою надежность в глазах простых людей и у государственных институтов, сегодня пенсионные фонды в развитых странах являются одними из наилучших инвесторов, которые аккумулируют значительные средства и служат хорошей страховкой в случае наступления кризисных периодов.

Безусловно, существуют там и социальные, выплачиваемые из бюджета пенсии, однако их размер, у нас позволяет только выживать. Там же человек может на эту пенсию жить. Неудивительно, что наши туристы, когда попадают в европейские страны, замечают, что там основную массу путешествующих людей составляют дети и люди пожилого возраста. Дети, потому что лживый лозунг советской власти «Все лучшее – детям» там реально работает. А люди пожилые - потому что работали очень интенсивно, хорошо зарабатывали, не имея много свободного времени и теперь у них есть средства для того, чтобы отдохнуть и посмотреть мир.

У нас же трудятся и молодой и старый, но до гробовой доски еле сводят концы с концами. Безусловно, под тяжестью экономических проблем наше правительство вынуждено будет пойти на пенсионную реформу. Но какая реформа может быть без реформ в экономике? Несколько лет тому назад правительство предлагало поднять пенсионный возраст, что вызвало волну недовольства в обществе. Сегодня поднимать планку выхода на пенсию нельзя. Ведь продолжительность жизни, особенно в «условно чистых» чернобыльских районах, в последние десятилетия неумолимо сокращается. Снижать пенсии – самоубийство для власти. Поэтому, скорее всего, правительство ограничится полумерами: ликвидируют возрастные льготы при выходе на пенсию, перестанут выплачивать пенсии работающим пенсионерам и даже могут пойти на негласное замораживание пенсий. Но, уважаемые обыватели, главное – чтобы не начали брать на вооружение опыт Китая, у которого, говоря словами наших высших госчиновников, мы должны учиться. В Китае пенсий не платят вообще. Там партийное руководство считает, что о стариках должны заботиться их дети.

Посоветовать же здесь можно только одно: учитесь, уважаемые обыватели вкладывать деньги, сберегать их. Раз государство не очень заботит наше будущее – нужно заботиться о нем самим.

Андрей ЮРКОВ, тел.623 61 08

Президентство — по наследству

Когда-то в Беларуси ходил такой анекдот: "Александр Лукашенко устал быть президентом. Коронация назначена на четверг". Тогда над этим все смеялись. Сейчас, глядя на современные тенденции во власти — уже не доф смеха. Похоже, что на двух ближайших президентских выборах президентом снова станет Лукашенко. Только звать его будут Виктором.

Уж слишком активно Александр Лукашенко продвигает во власть своего сына. И не просто так продвигает, а сразу на руководящие должности и с нарушением собственных указов и законов.

Даже в Трудовом кодексе записано, что близкие родственники не могут находиться в прямом подчинении (муж директор — жена бухгалтер). Тем не менее, А.Лукашенко ввел В.Лукашенко в Совет Безопасности. Председатель этого совета — Александр Лукашенко. Витя Лукашенко находится в его подчинении.

А недавно "в целях дебюрократизации" Указом президента №58 от 30.01.2007 г., Администрация президента сокращена аж на пять человек. При этом двое из "сокращенцев" переведены в "Государственный секретариат Совета Безопасности Республики Беларусь для обеспечения деятельности помощника Президента Республики Беларусь по национальной безопасности".

На основании этих сведений можно сделать точный вывод: Виктор Лукашенко не является рядовым членом Совета безопасности, а входит в его секретариат. И именно ему приданы эти двое помощников, призванных сделать все, чтобы бывший пограничник Виктор Лукашенко ненароком не запутался в сложных вопросах национальной безопасности.

Интересно, что в указе №58 имеется п.2.2, который в опубликованной версии звучит следующим образом: "Для служебного пользования". Возможно, что именно этим пунктом определены конкретные обязанности Виктора Лукашенко, которые не предназначены для широкого круга.

Эксперты полагают, что Виктор Лукашенко будет выполнять роль "серого кардинала" при Викторе Шеймане. Но нам кажется, это слишком мелко для любимого сна президента.

Скорее всего, А.Лукашенко когда-нибудь скажет Вите: "Оставайся, мальчик, с нами, будешь нашим королем!".

Леон Александров

У Магілёве абласная канфэрэнцыя дэлегатаў меркаванага Кангрэсу дэмсілаў не адбылася з-за адсутнасьці кворума

На рэгіянальны форум сабралася менш за дзьве трацiны ад сьпісачнага складу дэлегатаў, што не дазволіла яму займець неабходную легітымнасьць для вырашэньня такіх пытаньняў, як зацьверджаньне канчатковага складу дэлегацыі, абраньне 7-мі дадатковых дэлегатаў "ад сябе", вызначэньне VIP-пэрсонаў на Кангрэс ад рэгіёну. Кворум ня склаўся ў выніку байкатаваньня абласной канфэрэнцыі з боку дэлегатаў ад рэгіянальнай кааліцыі дэмакратычных сілаў, пра якое кіраўнікі кааліцыі папярэдне паведамілі на адмысловай прэс-канфэрэнцыі.

Па прапанове прадстаўнічай дэлегацыі зь Менску, якая складалася з прадстаўнікоў Палітрады Аб'яднаных дэмакратычных сілаў, магілёўскія дэлегаты пагадзіліся замест канфэрэнцыі правесьці сход, не абцяжараны ніякімі паўнамоцтвамі. Карыстаючыся прысутнасьцю С.Калякіна, С.Багданкевіча, Ю.Хадыкі, А.Бухвостава, А.Сідарэвіча ўдзельнікі схода выявілі жаданьне паслухаць іхныя меркаваньні і камэнтары аб праектах асноўных дакумэнтаў, якія будуць вынесеныя на разгляд Кангрэсу.

У часе некаторых выступаў дэлегатаў на адрас прысутных прадстаўнікоў Палітрады і Аргкамітэту выказваліся крытычныя заўвагі і нават прэтэнзіі да іхных учынкаў у пэрыяд падрыхтоўкі да Кангрэсу. Аднак паколькі ані госьці зь Менску, ані ўдзельнікі сходу ня мелі адпаведных паўнамоцтваў для апэратыўнага вырашэньня паўсталых праблемаў, было дамоўлена перанесьці іхны разгляд з удзелам зацікаўленых асобаў непасрэдна ў Палітраду і Аргкамітэт, якія мяркуюць сабрацца напачатку тыдня.

Затым удзельнікі сходу правялі, як гэта і прадугледжвалася, патаемнае галасаваньне па ўсіх 5-ці пытаньнях, прапанаваных Палітрадай і Аргкамітэтам для папярэдняга абмеркаваньня ў рэгіёнах. Вынікі галасаваньня паказалі, што пераважная большасьць прысутных дэлегатаў выказалася за тое, каб Аб'яднанымі дэмакратычнымі сіламі краіны кіраваў калектыўны орган, а ягоных сустаршыняў, якія б адказвалі за канкрэтныя кірункі агульнай працы, можна было б зьмяняць.

Віктар Войт

Belngo.info

Магілёўскія праваабаронцы дапамагаюць працоўным

10 траўня ў Горках адбылася сустрэча былых супрацоўнікаў ЧУП «БелРосСтрой», якія па некалькі месяцаў ня могуць атрымаць разьлік, з прадстаўніком Магілёўскага праваабарнончага цэнтру Барысам Бухелем. У сустрэчы, якая была арганізавана Горацкай рэгіянальнай кааліцыяй дэмсілаў, удзельнічаў таксама лідэр кааліцыі Андрэй Юркоў.

Барыс Бухель растлумачыў прысутным іх правы, параіўшы зьвяртацца ў розныя інстанцыі са скаргамі ня толькі на фірму «БелРосСтрой», але й на яе гаспадара Ігара Ізмайловіча. Усяго ж у якасьці "падманутых працаўнікоў" у Горках апынуліся больш за 50 чалавек, якім фірма павінна сумы ад 500 тысячаў да некалькіх мільёнаў рублёў.

Працаўнікі разам з праваабаронцамі выпрацавалі плян дзеяньняў, у якім, акрамя скаргаў, плянуецца правядзеньне пікетаў ды іншых акцыяў пратэсту.

Эдуард Брокараў

Горацкія дэлегаты адмовіліся ад удзелу ў Магілёўскім абласным міні-Кангрэсе

Горацкая рэгіянальная кааліцыя дэмакратычных сілаў распаўсюдзіла заяву аб тым, што дэлегаты ад рэгіёну ня будуць браць удзел у абласным Кангрэсе дэмакратычных сілаў. Дакумэнт быў прыняты пасьля яго абмеркаваньня сябрамі кааліцыі, якія маюць права на ўдзел у працы Кангрэсу дэмсілаў, і прадстаўнікамі суполак палітычных партыяў. У заяве гаворыцца, што мясцовым актывістам незразумелы прынцып фарміраваньня складу дэлегатаў. Аўтары дакумэнту таксама абвінавацілі арганізатараў Кангрэсу у адыходзе ад дэмакратыі, перавышэньні паўнамоцтваў і нізкім арганізацыйным узроўні працы па падрыхтоўцы форуму.

Сябры Горацкай кааліцыі заклікалі прадстаўнікоў іншых рэгіёнаў Беларусі далучыцца да іх рашэньня. Яны таксама пакідаюць за сабой права самастойна прымаць рашэньне аб магчымым удзеле ў агульнанацыянальным Кангрэсе дэмакратычных сілаў.

Эдуард Брокараў

Магілёўскія студэнты правялі мітынг ў абарону ільготаў

Восьмага траўня ў Магілёве прайшоў мітынг студэнтаў, не задаволеных меркаванай адменай ільготаў. Блізу сотні маладых людзей сабраліся бліжэй да сканчэньня працоўнага дня на Савецкай плошчы. Маладыя людзі ўзьнялі папяровыя аркушы зь літарамі, якія разам склалі фразу: "Куды ідуць нашыя ільготы?"

Далей студэнты накіраваліся да Зорнай плошчы, запрашаючы сустрэчных людзей, асабліва маладых, далучацца да іхняй калёны, над якой нехта разгарнуў бел-чырвона-белы сьцяг. Спроба міліцыянтаў адабраць сьцяг плёну не дала. У цэнтры Зорнай плошчы студэнты арганізавалі падпісны грамадзкі пункт у падтрымку свайго патрабаваньня. Міліцыя рабіла відэаздымку ўсіх удзельнікаў студэнцкай акцыі, а таксама тых, хто ставіў свой подпіс пад калектыўнай пэтыцыяй да прэзыдэнта, ураду і дэпутатаў.

Акцыя скончылася без затрыманьняў.

Віктар Войт

Belngo.info

Прадстаўнікі таварыстваў уласьнікаў жыльля сустрэліся з горацкімі актывістамі

У апошнія дні красавіка ў Горках і Магілеве прайшлі сустрэчы прадстаўнікоў таварыстваў уласьнікаў жыльля зь Менску і мясцовых актывістаў, якіх не задавальняе якасьць камунальнага абслугоўваньня. Госьці са сталіцы падзяліліся досьведам «барацьбы з камунальнікамі» і распавялі аб станоўчых зьменах у якасьці абслугоўваньня жылых дамоў, уласьнікамі якіх зьяўляюцца жыльлёвыя таварыствы.

Як вядома, за межамі сталіцы пераважная большасьць жылога фонду знаходзіцца на балянсе дзяржаўных камунгасаў, якія, зьбіраючы з жыхароў грошы, практычна не займаюцца ні абслугоўваньнем дамоў, ні капітальным рамонтам. Красамоўны факт выяўлены ў Магілёве, дзе на тэрыторыі ЖЭС-9 уведзеная дадатковая аплата за ўборку лесьвічных пляцовак прыватнай фірмай, хаця аплата гэтай паслугі ўваходзіць у рахунак за тэхнічнае абслугоўваньне. Фактычна ж лесьвіцы там не прыбірае ніхто.

У Горках госьці пазнаёміліся з працай аднаго з жыльлёвых кааператываў, які адмовіўся ад паслуг камунальнікаў і самастойна з посьпехам вырашае ўсе пытаньні ўтрыманьня дома.

Напрыканцы сустрэчаў іх удзельнікі дамовіліся аб сумесных дзеяньнях дзеля падвышэньня якасьці камунальных паслуг.

Эдуард Брокараў

Праваабаронцы заклікаюць адхіліць кандыдатуру Беларусі

Звыш 40 праваабарончых арганізацыяў з розных краінаў заклікалі Генэральную асамблею ААН адхіліць кандыдатуру Беларусі, якая прэтэндуе на месца ў Радзе ААН у пытаньнях правоў чалавека.

У звароце праваабаронцаў адзначаецца, што шматлікія парушэньні правоў чалавека, дапушчаныя беларускімі ўладамі, робяць "абсалютна непрымальным" удзел Беларусі ў працы праваабарончага ведамства ААН.

Арганізацыя "Human Rights Watch" назвала пазыцыю афіцыйнага Менску ў пытаньні датрыманьня правоў чалавека "жахлівай і бессаромнай"

Галасаваньне аб кандыдатуры Беларусі мае прайсьці ў Генэральнай асамблеі ААН 17 траўня.

Радыё Свабода

Рэфэрэндум дзеля абароны гістарычнай часткі Горадні

3 траўня прадстаўнікі інтэлігенцыі горада і грамадзкія актывісты абвесьцілі аб пачатку стварэньня ініцыятыўнай групы па арганізацыі рэфэрэндума дзеля абароны гістарычнай часткі горада. У бліжэйшы час у гарвыканкам будуць пададзены дакумэнты для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы. У падтрымку правядзеньня рэферэндуму неабходна сабраць подпісы ня менш 10% ад колькасьці выбарцаў Горадні.

Ініцыятарамі акцыі сталі дактары гістарычных навук Алесь Смалянчук і Аляксандар Краўцэвіч, мастакі Алесь Сураў і Ўладзімер Кіслы, гісторыкі Сяргей Салей і Андрэй Вашкевіч, каваль-рэстаўратар Юрась Мацко, заснавальнік і ганаровы старшыня ГА «Саюз палякаў Беларусі» Тадэвуш Гавін, старшыня ГА «Цівіне» Альгіс Дзіргінчус, дэпутат гарсавета Сяргей Кузьмянок, журналісты Натальля Макушына, Алесь Залеўскі і Павал Мажэйка.

"Мы заклікаем усіх, каму неабыякавы лёс гораду, прыняць удзел у стварэньні ініцыятыўнай групы. Ад нашых сумесных намаганьняў залежыць, ці захавае Горадня свой гістарычны вобраз, ці ператворыцца ў бэтонна-плітачную пляцоўку", - адзначыў Алесь Смалянчук.

На сёньняшні дзень са старажытнай мапы горада зьнікла больш за 20 будынкаў, была зьмененая гістарычная пляніроўка Савецкай плошчы, моцна пацярпелі археалагічныя пласты XV-XX стагодзьдзяў у цэнтры гораду. Улады маюць намер зьнесьці яшчэ 70 пабудоваў.

Алесь Васількевіч

Гісторыкі спрабавалі спыніць незаконныя раскопкі

Трэцяга траўня гарадзенскія гісторыкі паспрабавалі спыніць працу бульдозэру, які капаў тэрыторыю каля старой гарадзенскай сынагогі. Занепакоенасьць краязнаўцаў выклікаў той факт, што працы ў гістарычным цэнтры Горадні вядуцца без нагляду адмыслоўцаў-археолягаў.

Праз пэўны час да людзей прыехаў гарадзенскі мэр Аляксандар Антоненка, які патлумачыў, што "сынагога чапацца ня будзе, а толькі ідзе падсыпка схілу каля яе". Ніхто з грамадзкіх актывістаў словам старшыні выканкаму, аднак, не паверыў. Яны паспрабавалі стаць на шляху бульдозэру. У выніку міліцыя затрымала 5 чалавек, сярод якіх быў і вядомы гарадзенскі гісторык Алесь Смалянчук. Супрацьстаяньне гарадзенскіх чыноўнікаў і грамадзкіх актывістаў з нагоды рэканструкцыі Старога гораду працягваецца ўжо некалькі месяцаў. Актывізацыя супрацiву пачалася пасьля капітальнай перабудовы цэнтральнай плошчы Горадні – Савецкай. На думку гісторыкаў, перабудова фактычна зьнішчае старажытнае аблічча цэнтру гораду.

Алесь Васількевіч

"Freedom House": Беларусь – у аўтсайдэрах паводле свабоды прэсы

Праваабарончая арганізацыя "Freedom House" апублікавала штогадовую справаздачу, прысьвечаную сытуацыі ў галіне свабоды прэсы ў сьвеце ў 2006 годзе. Як і ў мінулыя гады, Беларусь аднесеная да ліку "несвабодных" краінаў і займае адно з апошніх месцаў у сьпісе 195 дзяржаваў сьвету.

У справаздачах, якія "Freedom House" публікуе з 1980 году, ацэньваецца ступень свабоды распаўсюджваньня інфармацыі праз друкаваныя выданьні, радыё і тэлебачаньне, а таксама праз інтэрнэт.

У сёлетнім дакумэнце адзначана, што за 2006 год у некаторых краінах якраз інтэрнэт стаў аб'ектам цэнзуры або быў закрыты доступ да паасобных сайтаў.

У сэнсе свабоды мэдыяў, паводле "Freedom House", зь ліку 195 краінаў сьвету 74 – "свабодныя", 58 – "часткова свабодныя" – і 63 – "несвабодныя". Найлепшая сытуацыя ў Фінляндыі і Ісьляндыі, а таксама ў Бэльгіі, Даніі, Нарвэгіі і Швэцыі. Што да былых камуністычных краінаў і краінаў СНД, дык мэдыі найболей свабодныя ў Эстоніі, Чэхіі, Літве, Латвіі і Славаччыне, а найменей свабодныя ў Туркмэністане і Ўзбэкістане.

У агульным сьпісе Беларусь пастаўлена на 186-м месцы. Горшыя за яе ў сэнсе свабоды слова і друку краіны – Паўночная Карэя, Туркмэністан, Лібія, Куба, Бірма, Эрытрэя, Узбэкістан, Зымбабвэ і Экватарыяльная Гвінэя. У гэтых краінах, паводле "Freedom House", свабодныя мэдыі або ўвогуле не існуюць, або распаўсюджваюцца ў такіх невялікіх маштабах, якіх недастаткова, каб данесьці да грамадзтва альтэрнатыўную, непадцэнзурную інфармацыю.

Паводле справаздачы "Freedom House", беларускія ўлады пайшлі па шляху ня проста грубага закрыцьця выданьняў, але іх максымальнага абмежаваньня нібыта ў рамках існуючага заканадаўства. "Freedom House" канстатуе, што ўлады ў Беларусі скарыстоўваюць дзяржаўную манаполію на друк і распаўсюджваньне пэрыядычных выданьняў.

"Усьлед за такімі краінамі, як Расея, беларускія ўлады спрабуюць кантраляваць таксама і інтэрнэт – апошнюю крыніцу незалежнай думкі. Паколькі дзяржаўная кампанія "Белтэлекам" зьяўляецца манапалістам на рынку электронных мэдыяў, улады блякуюць некаторыя інтэрнэт-старонкі ў моманты, асабліва істотныя для рэжыму, напрыклад, падчас выбараў", – паведамляецца ў сёлетняй справаздачы "Freedom House" пра свабоду слова і друку ў сьвеце.

Кастусь Бандарук, Радыё Свабода

«ГОРЕЦКИЙ ВЫБОР» Антибашистская газета. №17, май 2007г. Издатель и главный редактор -Эдуард БРОКАРЕВ. Тел. 545 89 83. Издание непериодическое, выходит по мере возможности. Тираж 299 экземпляров.